# БЕЛАРУСКАЯ МОВА Ў ІНФАРМАЦЫЙНАЙ ПРАСТОРЫ

*Каралёў Руслан*

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Саўчык М.К. - выкладчык*

Уартыкуле разглядаецца пытанне выкарыстання беларускай мовы ў інфармацыйнай прасторы, аб з’яўленні беларускамоўных старонак у сацыяльных сетках.

Беларуская мова – гэта нацыянальная мова беларускага народа. Яна мае шматвяковую гісторыю. Стваралася і развівалася беларуская нацыянальная мова ў складаных гістарычных умовах, у непарыўнай сувязі са стварэннем і развіццём беларускай нацыі.

Ва ўсе перыяды гістарычнага развіцця беларусы захоўвалі і развівалі свае культурныя традыцыі, стваралі цудоўныя творы народнага і прафесійнага мастацтва.

Перш чым утварылася беларуская народнасць і сфарміравалася яе мова, у жыцці ўсходняга славянства адбылося многа важных падзей, якія паўплывалі на яе стан і развіццё.

Вось і зараз наша краіна не стаіць убаку, а актыўна асвойвае і мадэрнізуе новыя тэхналогіі. Інтэрнэт-камунікацыя адносіцца да такіх сучасных сфер зносін, якія накіраваны на перспектыву, на будучыню. Па падліках замежных спецыялістаў сёння ўсе мовы свету адносна інтэрнэта падзяляюцца на дзве вялікія групы: мовы, якія выкарыстоўваюцца ў інтэрнэце і якія не выкарыстоўваюцца. З усёй колькасці моў свету толькі 3,6% моў выкарыстоўваюцца ў інтэрнэт-прасторы. Беларуская мова, па падліках замежных спецыялістаў, разам з італьянскай адносіцца да групы моў, якая дастаткова шырока выкарыстоўваецца ў інтэрнэт-сетцы. Напрыклад, для папулярызацыі беларускай культуры прыватныя асобы і недзяржаўныя ўстановы выкарыстоўвалі магчымасці Інтэрнэту. Найбольшую вядомасць набыў створаны ў 2002 г. Андрэем Дыбоўскім сайт «Глобус Беларусі» (http://globustut.by/). У тым жа годзе запрацаваў віртуальны музей «Беларуская саломка» (http://straw.iatp.by).

Беларуская мова з’яўляецца рэальна запатрабаванай для прасунутай часткі нашага грамадства. У інфармацыйным свеце амаль кожны беларускі сайт напісаны на нашай роднай мове або мае пераключэнне з рускай мовы на беларускую. У інтэрнеце ёсць многа беларускіх кніг, якія чытаюць ва ўсім свеце і могуць захапіць чытачоў розных узростаў.

З кожным днём з'яўляецца ўсё больш беларускамоўных старонак, усё больш карыстальнікаў вядуць свае блогі на роднай мове. Такія сацыяльныя сеткі, як «Фэйсбук» і «У кантакце» маюць даволі добры беларускі інтэрфэйс.

Беларусь прымае ўдзел у праграмах развіцця інфармацыйны-камунікатыўных тэхналогій (ІКТ) такіх міжнародных арганізацый, як ААН, Міжнародны саюз электрасувязі, Рэгіянальная садружнасць у галіне сувязі краін СНД, што забяспечвае сур’ёзную кансультатыўна-тэхнічную падтрымку пры распрацоўцы стратэгіі развіцця ІТ.

Людзі аб'ядноўваюцца паводле сваіх інтарэсаў і ствараюць цікавыя беларускамоўныя старонкі, тэматычныя сайты. Усё больш роднай літаратуры, музыкі і мастацтва з'яўляецца на прасторах інтэрнэту.

Папулярным становіцца вывучэнне беларускай мовы ў інтэрнэце. Гэта звязана са зручнасцю і даступнасцю, якія прадастаўляюць інтэрнэт-курсы і прыкладанні для вывучэння мовы.

У заключэнне можна зрабіць выснову, што беларуская мова ў інфармацыйным свеце становіцца ўсё больш і больш запатрабаванай.

**Спіс выкарыстаных крыніц:**

*1. Аляксандр Лукашанец: на пашырэнне ўжывання беларускай мовы значна ўплывае інтэрнэт. » [Электронны рэсурс] - Рэжым доступу https://www.sb.by/articles/alyaksandr-lukashanets-na-pashyrenne-zhyvannya-belaruskay-movy-znachna-plyvae-internet.html - Дата доступу: 28.1.2023.*

*2. Д.А. Крывашэй. Інфармацыйна-камунікацыйныя тэналогіі ў сферы культуры Беларусі. [Электронны рэсурс] - Рэжым доступу.https://rep.brsu.by/bitstream/handle/123456789/2048/vesnik._seryya_2._gistoryya._ekanomika._prava._-_no_2._-_2016_26-33.pdf?sequence=1 – Дата доступу: 29.11.2023.*